*В. В. АНІПЯРКОЎ*

# ФОРМЫ ДАЛУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ ДА ТАРГАВІЦКАЙ КАНФЕДЭРАЦЫІ

В ходе анализа книг конфедератских судов предлагается дополнительный критерий для определения позиции дворянства белорусских земель в политических событиях 1792-1793 гг. Выделяются четыре основные формы присоединения дворянства к Тарговицкой конфедерации.

The additional criteria in the definition of the position of Belarusian nobility are offered on the basis of the analysis of writings on confederation law during political events of 1792-1793. The author determines four basic forms of nobility joining the confederation of Targovitza.

Таргавіцкая канфедэрацыя (май 1792 - верасень 1793 г.) была формай рэалізацыі палітычных інтарэсаў Расійскай імперыі на землях Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) і Польскай Кароны. Выпрацоўка новых крытэрыяў ацэнкі адносін шляхты да таргавіцкіх падзей падаецца адной з найбольш актуальных задач пры вывучэнні дадзенага перыяду палітычнай гісторыі. Незалежна ад свайго характару, высновы адносна гэтага аспекту рабіліся даследчыкамі пераважна на падставе апавядальных крыніц. Між тым стаўленне шляхціца да Таргавіцы непасрэдна фіксавалася ў асобным дакуменце, які быў абазначаны ў кнігах канфедэрацкіх судоў тэрмінам "акцэс" (ад лац. *accessus* - уваходжанне). Да гэтага часу дакументы ўваходжання ў Таргавіцкую канфедэрацыю не з'яўляліся аб'ектам спецыяльнага даследавання.

Па сваёй функцыі акцэсы былі формай рэгулявання стасункаў паміж асобнымі шляхціцамі і канфедэрацкім кіраўніцтвам. Пасля далучэння караля і вялікага князя літоўскага Станіслава Панятоўскага з войскам да Таргавіцкай канфедэрацыі (24 ліпеня 1792 г.) факт шляхецкага акцэса пераставаў быць сведчаннем унутраных палітычных прыярытэтаў, ператвараючыся хутчэй у форму асабістага прызнання канфедэрацыі ўладай на землях ВКЛ. Улічваючы, што пасля 24 ліпеня ўлада таргавічан набыла неабходныя атрыбуты легітымнасці, адмова ад удзелу ў канфедэрацыі пачала трактавацца як непаслушэнства дзяржаўнаму кіраўніцтву. "Мы спадзяёмся, - адзначалася адносна каралеўскага акцэса ва універсале Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ, - што гэты крок Я[го] К[аралеўскай] М[ос]ці Уладара нашага любімага будзе мацнейшым па-над усімі меркаваннямі, якія нас з намі дзялілі [...] А калі яшчэ і гэты знамянальны довад добрай справы не прыняты быў тым сэрцам, як быць павінен, [...] няхай кожны, хто марудзіць са злучэннем, улічыць, што інакш быць разгляданым Краёвым Кіраўніцтвам не можа, толькі як супраціўнік Народа і Караля". Мясцовым канфедэрацыям ставілася ў абавязак на працягу месяца пераслаць у Вільню акцэсы ўсіх абывацеляў "з пазначэннем тых, хто яшчэ марудзіць з іх складаннем, з тым, каб ужыць дзейныя меры да ўтрымання нацыянальнай павагі, якая не можа з абыякавасцю глядзець на непаслухмянасць Краёвай Юрысдыкцыіі[1]. (Тут і далей пераклад аўтара. - *В. А.)* У сітуацыі спынення баявых дзеянняў таргавіцкі акцэс перастаў быць прадметам палітычнага выбару, набываючы характар неабходнасці: адмова ўступіць у канфедэрацыю азначала пазбаўленне грамадзянскіх правоў, пасля чаго наступала эміграцыя без права вяртання на радзіму і ўласнасць. Характэрна, што ва універсале польнага гетмана Ш. Касакоўскага пэўныя групы асоб за актыўны ўдзел у мінулых рэформах былі пазбаўлены права далучацца да Таргавіцкай канфедэрацыі, што разглядалася як істотнае пакаранне[2]. Такім чынам, капітуляцыя палітычнага кіраўніцтва Рэчы Паспалітай паставіла шляхецкія масы перад непазбежнасцю далучэння да Таргавіцы, паступова напаўняючы канцылярскія кнігі канфедэрацыі тысячамі акцэсаў.

Навуковую вартасць гэтых дакументаў выратоўвае тое, што ў тагачаснай палітычнай сітуацыі далучэнне да Таргавіцы не змагло ператварыцца ў простае выкананне фармальнай працэдуры. Працэс складання акцэсаў як для кіраўніцтва канфедэрацыі, так і для шляхецкай супольнасці быў ускладнены супярэчлівымі аспектамі з рэчышча ўяўленняў аб палітычнай карэктнасці, псіхалогіі ды этыкі шляхецкіх паводзін. З гэтай прычыны абодва бакі прынцыповым момантам лічылі не толькі факт складання акцэса, але і форму, праз якую шляхціц прыступаў да канфедэрацыі.

Пры ўтварэнні Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ яе акт змясціў дэкларацыю аб прыняцці "ва ўсіх матывах, выразах і жаданнях" акта каронная канфедэрацыі з абвешчаным у Таргавіцы ўзорам далучэння да канфедэрацыі, "нібыта ён быў праз нас саміх скпадзеным [...], нічога са зместу яго не выключаючы"[3]. Адметнасцю гэтага дакумента быў тэкст прысягі з абавязацельствам таго, хто далучаўся да канфедэрацыі, аказваць супраціўленне пашырэнню каралеўскай улады, "тых, хто супраць свабодаў шляхецкіх, за спадчыннасць трона, за пашырэнне ўлады каралёў" выдаваць канфедэрацкаму кіраўніцтву, не мець з імі "аніякага паразумення", а "канстытуцыю Трэцяга мая, як труну вольнасці і Рэспублікі, усімі сіламі нішчыць"[4]. Апошняе выслоўе мела найбольшую вартасць, калі ўлічыць, што ў лютым 1792 г. землеўласнікі 18 з 20 беларускіх паветаў ВКЛ звязалі сябе прысягай абараняць канстытуцыю 1791 г. коштам уласнага "ўладання і жыцця"[5]. Праз ініцыятараў Таргавіцы Кацярына II стала запэўненай у тым, што вынікі лютаўскіх сеймікаў 1792 г. былі наступствам звыклага для краіны палітычнага прымусу. Напаўняючы акты створаных канфедэрацый лозунгам! жорсткага рэспубліканізму, таргавіцкае кіраўніцтва вылучала імкненне ідэалагічнага рэваншу, ілюстрацыяй якога мусілі стаць дзесяткі тысяч шляхецкіх прысяг, выкананых у форме радыкальнага непрымання канстытуцыі 3 мая.

Пакуль ішлі баі, шляхта, аднак, лічыла за лепшае пазбягаць сустрэч з прэтэндэнтамі на новае палітычнае кіраўніцтва, кідаючы ўладанні і, па прыкладу войск Рэчы Паспалітай, ссоўваючыся на захад. Расійскія афіцэры, задзейнічаныя ва ўтварэнні канфедэрацый, згадваюць у лістах, як "многія [са шляхты], пакідаючы хаты, хаваюцца па лясах"[6]. У сітуацыі палітычнай няпэўнасці шляхецкая правінцыя заняла пазіцыю чакання, упарта патрабуючы інструкцый з варшаўскага цэнтра. Вуснамі Станіслава Аўгуста той абвясціў адсутнасць іншага "спосабу выратавання грамадзян, толькі як праз акцэс". Універсал, выданы каралём з тлумачэннем ягонага далучэння да Таргавіцкай канфедэрацыі, падсумоўваў: "Калі зрабілася немагчымым захаванне ўсіх ухвалаў нашага сейма, то, прынамсі, можна спадзявацца захаваць асобныя з іх"[7]. У выніку вайны частка цэнтральных і рэгіянальных ураднікаў Рэчы Паспалітай апынулася ў Варшаве. "Намерам Я[го] К[аралеўскай] М[ос]ці" гэтая група пачала рэгістраваць у сталічнай канцылярыі акты далучэнняў да Таргавіцы. Скпадзеныя па аднаму ўзору, яны змяшчалі наступны тэкст: "Калі Я[го] К[аралеўская] М[ос]ць Уладар наш міласцівы ў намеры як найхутчэйшага прадухілення краёвых замяшанняў, зберагання краю і вяртання яму супакою вырашыў акцэсам сваім прыступіць да канфедэрацыі, я, сагрэты гэтакімі пабудкамі і гэтакім кіраўніцтвам, прыступаю праз гэты акцэс да гэтай самай канфедэрацыі і да яе ўваходжу"[8]. Па прыкладу сталіцы акцэсы, запісаныя ў падобнай форме, з сярэдзіны жніўня пачынаюць трапляць у канцылярыі рэгіянальных канфедэрацый на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага.

Рэакцыяй кіраўніцтва Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ на ўзнікшую сітуацыю стаў універсал ад 3 жніўня 1792 г. Пры адсутнасці маршалка (абвешчаны на гэтай пасадзе А. Сапега прамарудзіў з далучэннем да канфедэрацыі да Южніўня) універсал падпісалі сем консулаў. "Ведаем наш сціслы абавязак, - адзначалі яны, - сцерагчы ўсё тое найдакладней, што Акт Генеральнай канфедэрацыі ўтрымлівае [...] Калі тыя ж самыя ["якія зрабіліся апосталамі да забеспячэння прысягай Уставы 3 мая"] ужываюць новыя выкруты, насоўваючы на сябе авечую шкуру ў далучэнні да нашай канфедэрацыі, але з рознымі кляўзамі [...], чынім адкрыта і абвяшчаем усім, што кнігі па ўсіх в[аяводс]твах і п[аве]тах да запісання Акцэсаў не даўжэй як да 15 дня жніўня адкрытыя мець жадаем [...] Да якіх акцэсы ў іншай форме, што прымацца не будуць, засцерагаем"[9].

Патрабуючы выразнага вырачэння абавязацельстваў, узятых шляхтай адносна канстытуцыі 3 мая, тэкст таргавіцкай прысягі пераводзіў праблему далучэння да канфедэрацыі ў кантэкст псіхалогіі. У свядомасці шляхты патрабаванні палітычнай мэтазгоднасці канкурыравалі з этычнымі ўяўленнямі аб неабходнасці захавання імя ў вачах наступных пакаленняў ды ўтрымання вернасці дадзенаму слову. Этычную афарбоўку аспект далучэння да Таргавіцы выразна набывае ў сітуацыях, калі Генеральная канфедэрацыя ў тэксце прысягі спрабуе

абавязаць шляхту не пералічваць складзеныя акцэсы ў якасці граху на споведзі, а тая ў сваю чаргу - перад прыходам расійскіх войск - адмыслова заносіць у канцылярскія кнігі сведчанні, у якіх загадзя адракаецца ад любых клятваў, якія будзе складаць адносна канфедэрацыі[10]. У лісце да Станіслава Аўгуста Т. Ваўжэцкі, былы арганізатар працэдуры ўхвалення канстытуцыі 3 мая ліцвінскімі сеймікамі шляхты, адзначаў: "Акцэс паводле акта, у Варшаве здзейсненага, мусіць быць дастатковы для з'яднання кожнага ў хатнім спакоі; усе грамадзяне без абразы такі самы акцэс зрабілі бы, і я б яго не пазбягаў. Але калі, Найяснейшы Уладару, акрамя тага спосабу акцэса гвалт [Генеральнай канфедэрацыі] іншы навязваць ці перапрысяганне вымушаць захоча, ніколі не адважуся сам на сябе дадаваць знявагі подласці, выстаўлю сябе хутчэй на нястачу і выгнанне, чым на ганьбу ўсяго жыцця"[11]. 12 верасня кароль адказаў: "Неабходна тады яшчэ трошкі патрымаць паўзу, каб можна бяспечна раіць сябрам, што будуць павінныя яны рабіць".

Намаганні канфедэратаў дамагчыся выканання "законнага" ўзору прысягі перш за ўсё рэалізаваліся ў варунках абедзвюх сталіц. Канцылярыя Генеральнай канфедэрацыі ў Вільні, куды шляхта звярталася з найбольш значнымі праблемамі судовага і маёмаснага характару, іх вырашэнне ставіла ў залежнасць ад прыняцця зацверджанага фармуляра прысягі. Так, Міхал Клеафас Агінскі, літоўскі мечнік, 5 жніўня 1792 г. "намерам Я.К. М[ос]ці" абвесціўшы аб далучэнні да Таргавіцкай канфедэрацыі, праз месяц, каб зняць секвестр з уласных уладанняў, накіраваўся да Вільні, дзе 18 верасня выканаў прысягу з абавязкам змагацца супраць канстытуцыі 3 мая, выдаваць яе абаронцаў ды іншымі выслоўямі паводле ўзору Генеральнай канфедэрацыі[12]. Відавочныя магчымасці ціску таргавічане мелі ў дачыненні дзяржаўных службоўцаў, заробак якіх утрымліваўся да моманту выканання асобнай прысягі, прадпісанай ім распараджэннем Генеральнай канфедэрацыі, з падкрэсленым адмаўленнем канстытуцыі 1791 г.[13]

Рэха захадаў таргавіцкага кіраўніцтва знікала на абшары шляхецкай правінцыі. Дакументы канфедэрацкага справаводства не акцэнтуюць увагу на тлумачэнні гэтай з'явы, але даволі дакладна фіксуюць тэндэнцыю, пры якой жорсткія меры Генеральнай канфедэрацыі па спыненню выпадкаў непадпарадкавання яе распараджэнням суправаджаліся паралельным пашырэннем у рэгіёнах акцэсаў, альтэрнатыўных зацверджанаму ўзору. Магчымай прычынай выступала сціплае паходжанне большасці консулаў рэгіянальных канфедэрацый, што не дазваляла ім ісці на пагаршэнне адносін з першымі асобамі ўласнага павета. Мела месца таксама бюракратычнае імкненне засцерагчыся ад небяспекі ў стасунках з віленскім кіраўніцтвам, якое штурхала мясцовых консулаў да максімальнага змяншэння спіса "непадпісантаў", бо палітычная лаяльнасць павета вызначала не толькі колькасць індывідуальных секвестраў, але і шчыльнасць прысутнасці тут расійскага войска, забеспячэнне якога ператваралася ў сапраўдны галаўны боль большасці рэгіянальных канфедэрацый. У такой сітуацыі абставіны рабілі кожную мясцовую канфедэрацыю зацікаўленай у максімальнай лібералізацыі ўмоў складання шляхецкіх акцэсаў.

Прааналізуем практыку далучэння да Таргавіцкай канфедэрацыі на прыкладзе земляў Мінскага ваяводства[14]. Уваходжанне ў канфедэрацыю тут першапачаткова фіксуе "рэестр абываццеляў, якія склалі прысягу, да Акта вольнай канфедэрацыі В[аяводств]а М[інска]га" (дублікат тэксту, які быў зачытаны ў Таргавіцы). Сапраўдны два тыдні, да 16 ліпеня ён увабраў 158 подпісаў асоб, "інкарпараваных у канфедэрацыю". Пасля паўторнага адкрыцця кніг, засведчанага універсалам Генеральнай канфедэрацыі ад 3 жніўня, адбываецца замена ранейшага "рэестра абывацеляў, што скпалі прысягу", на "рэестр асабіста здзейсненых акцэсаў". Апошні выступае відавочна больш лёгкім для шляхецкага сумлення з прычыны адсутнасці ў ім пазначэння факта скпадзенай прысягі. На практыцы "асабіста здзейснены акцэс" - гэта ўпісанне сваёй рукой уласнага імя і прозвішча да адпаведнага рэестра канфедэрацкай актавай кнігі. Частка абы-

* 3 кастрычніка 1794 г. Тамаш Ваўжэцкі - "вышэйшы кіраўнік" паўстання на землях Рэчы Паспалітай. Біёграф Ваўжэцкага Б. Шындлер згадвае факт атрымання харунжым ВКЛ пашпарта на выезд з Рэчы Паспалітай, што было немагчыма без папярэдняга далучэння да Таргавіцкай канфедэрацыі. (S z y n d l e r B. Tomasz Wawrzecki: ostatni naczelnik powstania kosciuszkowskiego. Warszawa1 1976. S. 69.)

ваЦеляў гэтую працэдуру не жадае выконваць асабіста і, даручаючы паставіць подпіс за сябе іншай асобе, т. зв. "прадстаўніку", трапляе ў асобны "рэестр акцэсаў праз прадстаўнікоў па дакументах прадстаўніцтва". Прадастаўленне магчымасці пазбягання асабістага подпісу пад актам акцэса, такім чынам, - чарговая ўступка з боку ваяводскай канфедэрацыі. Асобныя шляхціцы дадаткова рэгіструюць у актавай кнізе дакументы з выкладаннем матываў далучэння да канфедэрацыі. Агульнай фармуліроўкай выступае спасылка "на прыклад", "намер" ці "кіраўніцтва Я.К. М[ос]ці". Выслоўі такога роду ўпісаны як у дакументы прадстаўніцтва, так і ў дакументы асобна складзеных акцэсаў, якія падаюцца ў адвольнай форме ў канцылярыю канфедэрацыі найбольш уплывовымі ўраднікамі ваяводства.

Звяртае на сябе ўвагу факт працягу рэгістрацыі акцэсаў у Мінскім ваяводстве за рамкі тэрміну, які быў абвешчаны універсалам Генеральнай канфедэрацыі ад 3 жніўня. Паводле яго тэксту, кнігі канфедэрацыі для скпадання акцэсаў мусілі зачыніцца 15 жніўня, тады як першыя дзевяць прозвішчаў у мінскім "рэестры асабіста складзеных акцэсаў" паказаны толькі 16 жніўня, 17 жніўня да іх дадаюцца яшчэ *13* прозвішчаў, 18 жніўня - *10,* 20 жніўня - *43,* 21 жніўня - *62,* нарэшце, 22 жніўня - *160* прозвішчаў, пасля чаго, з усяго відаць, канцылярыя абвяшчае рэгістрацыю акцэсаў спыненай, у далейшым адсылаючы жадаючых скласці іх да Вільні[15]. Практыка дзейнасці асобных канфедэрацый на Беларусі засведчыла больш працяглы перыяд прымання акцэсаў. У прыватнасці, у дакументах браслаўскай павятовай канфедэрацыі, створанай у маі 1792 г., апошняе сведчанне аб складзеным акцэсе датуецца 11 кастрычніка[16]. Часавы прамежак паміж датай абвяшчэння павятовай канфедэрацыі і датай уласнага акцэса - зручны крытэрый у высвятленні індывідуальнага стаўлення шляхціца да падзей 1792-1793 гг., бо больш позні час далучэння да Таргавіцы выступаў відавочным паказчыкам апазіцыйнасці адносна канфедэрацыі*.

Для шляхецкай супольнасці агульнай тэндэнцыяй з'яўлялася пашырэнне часткі акцэсаў, выкананых у формах, якія супярэчылі вымаганням Генеральнай канфедэрацыі, па меры павелічэння часавай адлегласці ад моманту абвяшчэння пэўнай рэгіянальнай канфедэрацыі. Кнігі канфедэрацкіх судоў, нягледзячы на разнастайнасць канкрэтных сітуацый, дазваляюць выдзеліць чатыры асноўныя формы далучэння беларускай шляхты да Таргавіцкай канфедэрацыі:

*1) далучэнне ў форме асабістага подпісу пад актам рэгіянальнай канфедэрацыі* па свайму характару было найбольш відавочным сведчаннем прызнання Таргавіцкай канфедэрацыі, пры якой шляхціц, задзейнічаны ў працэсе стварэння канфедэрацыі ва ўласным павеце, выступаў не толькі прыхільнікам, але і ініцыятарам узнікнення таргавіцкіх інстытутаў на рэгіянальным узроўні. Прыкладам такой формы далучэння да Таргавіцы з'яўляюцца подпісы *17* "дыгнітарыяў, ураднікаў і шляхты" пад актам "элекцыі канфедэрацкіх ураднікаў павета лідскага і эйшышскага" 17 ліпеня 1792 г.[17];

2) *далучэнне ў форме асабіста складзенай прысягі па ўзору Генеральнай канфедэрацыі,* як і ў папярэднім выпадку, змяшчала прынядце на сябе шырокага спектра абавязацельстваў, звязаных з адмаўленнем канстытуцыі 3 мая і барацьбой з прыхільнікамі мінулых рэформаў. У кнігах канфедэрацкіх судоў магло фіксавацца асабіста выкананым подпісам у рэестры асобаў, што склалі прысягу, кароткай згадкай мясцовай канцылярыі, што "асабіста стаўшы В[яльможны] Я[сны] П[ан] [імя, прозвішча шляхціца] і выканаўшы прысягу, прызначаную законам (у іншых выпадках - "формулай Генеральнай канфедэра-

* Адзначым факт няўпэўненай палітыкі Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ адносна абмежавання тэрміну скпадання щляхецкіх акцэсаў. Так, універсал Ш. Касакоўскага 26 чэрвеня 1792 г. абавязваў шляхту скласці прысягу на працягу двух тыдняў ад даты падпісання акта рэгіянальнай канфедэрацыі. Універсалам Генеральнай канфедэрацыі 3 жніўня тэрмін быў працягнуты да 15 жніўня, пры гэтым той, "хто прыходзіць з акцэсамі пасля скончанага часу" меў "вольнасць экзаменавання прычын" затрымкі перад консуламі Генеральнай канфедэрацыі ў Вільні. Шэраг рэгіянальных канфедэрацый, аднак, і пасля жніўня ўпісвалі акцэсы, самастойна пазначаючы пры іх рэгістрацыі прычыны шляхецкіх спазненняў.

цыі прадпісаную"), акцэс дадаў і здзейсніў, прыступаючы да Адзінства Канфедэрацыі", ці подпісам пад цалкам пададзеным тэкстам прысягі*;

*3) далучэнне да канфедэрацыі без складання прысягі* з'яўлялася праявай хісткага кампрамісу паміж таргавіцкім кіраўніцтвам і шляхецкай супольнасцю, пры якім першае атрымоўвала прызнанне ў якасці легітымнай улады, у той час як прадстаўнікі другой пазбягалі больш моцных формаў прыняцця Таргавіцкай канфедэрацыі, звязаных з клятвай вырачэння канстытуцыі 3 мая. З гэтай прычыны дадзеная форма далучэння да Таргавіцы можа быць разгледжана як выраз "памяркоўнай апазіцыйнасці". У канфедэрацкіх кнігах яна адлюстроўвалася тэкстам накшталт "асабіста стаўшы В.Я.П. [імя, прозвішча шляхціца] акцэс да канфедэрацыі павета [...] здзейсніў, выканаў і да адзінства яе ўласнай у мясцовым пратаколе рукой падпісаўся"[18] ці асабіста выкананым подпісам у рэестры акцэсаў, якія не ўтрымліваў пазначэння факта складзенай прысягі. Выключна жорсткай у дачыненні да кіраўніцтва канфедэрацыі дадзеную форму магла рабіць дадатковая спасылка на «намер (іншы варыянт - "кіраўніцтва") Я.К. М[ос]ці», што азначала адхіленне як галоўнага матыву таргавіцкага акта, у якім праглядалася спроба маўклівай дэтранізацыі Станіслава Аўгуста, так і старашляхецкай накіраванасці канфедэрацкай ідэалогіі. Фактарам далучэння да канфедэрацыі "кіраўніцтвам Я.К. М[ос]ці" быў варты ўвагі аспект псіхалагічнага апраўдання з перакладаннем палітычнай адказнасці за здзейснены крок на манарха. Як прыклад дакумента, складзенага ў гэтакай форме, прывядзём тэкст акцэса канюшага ВКЛ Александровіча: [10 жніўня 1792 г.] "Калі Я.К. Мосць і Уладар найміласцівы мэтай ушчаслівення Народа і вяртання спакою Рэчы Паспалітай да Акта Генеральнай канфедэрацыі, зробленага ў Таргавіцы, прыступіў і сваім сведчаннем да гэтакай справы акцэс здзейсніў, то я, подпісам ніжэйпазначаны, у поўным даверы да Яго Каралеўскай М[ос]ці пра паўсюднае дабро бацькоўскага старання, цяперашнім сведчаннем да Акта і Справы вышэйзгаданай канфедэрацыі прыступаю і гэтакі свой акцэс падпісваю"[19];

4) *прадастаўленне права подпісу пад дакументам далучэння ад уласнага імя іншай асобе* - найбольш слабая форма прызнання канфедэрацыі. Так, 22 жніўня 1792 г. Адам Хмара, мінскі ваявода, са спасылкай на ўзрост і далёкую адлегласць даручае свайму прадстаўніку Яну Комару скласці акцэс "мэтай намераў Я.К. М[ос]ці". У той жа дзень у ваяводскім "рэестры акцэсаў, падаваных на пісьме" адзначана "ад Я. В[яльможна]га Адама Хмары, мінскага ваяводы, В.Я. Пан Комар праз сябе напісаны і падпісаны акцэс да Канфедэрацыі Вольнай В[аяводст]ва Мінскага імем таго самага ваяводы здзейсніў, засведчыў і да актаў падаў"[20]. Далучэнне, якое не патрабавала пацвярджэння сваёй рукой і асабістай прысутнасці ў канцылярыі канфедэрацыі, з пункту гледжання шляхецкай псіхалогіі, безумоўна, выглядала найбольш лёгкім варыянтам далучэння да Таргавіцы. У большасці дакументы прадстаўніцтва складаліся нязадаўга, а часам і ў дзень падавання акцэса, што сведчыла пра прысутнасць большасці "актораў" у павеце. Нежаданне асабіста кантактаваць з прадстаўнікамі канфедэрацыі ўтрымлівала адценне пагардлівага стаўлення шляхціца да дзейнасці таргавіцкай адміністрацыі ва ўласным павеце: звычайна да таргавіцкай канцылярыі накіроўваліся адміністратары ўладанняў, суседзі, значна радзей - сваякі. Асобна звяртае на сябе ўвагу факт наяўнасці "прафесійных" давераных, якія рэгулярна дастаўлялі ў канцылярыю канфедэрацыі з мэтай рэгістрацыі акцэсаў сваім подпісам адразу па некалькі дакументаў прадстаўніцтва. На жаль, не выпадае высветліць, ці з'яўлялася іх дзейнасць выключна спецыялізаванай крыніцай прыбытку альбо вынікала з негалосных распараджэнняў рэгіянальных канфедэрацый.

* "Прысягаю Госпаду Богу ўсемагутнаму ў Тройцы Святой адзінаму, што канстытуцыю Трэцяга мая, як труну вольнасці Рэспублікі, усёй моццу нішчыць буду, улады польскіх каралёў пашырэння да-пускаць не буду, спадчыннасць трона і манархію ўсёй моццу адвяргаць буду, тых, хто супраць воль-насцей шляхецкіх за спадчыннасць трона, за пашырэнне ўлады каралёў інтрыгаваць, угаворваць ці чыніць махінацыі будуць, перад канфедэрацыяй і грамадскасцю выдаваць буду, на адарванне най-меншай часткі краю, ці яго ўласнасці дазваляць не буду, веру Святую каталіцкую Рымскую бараніць буду, з абаронцамі канстытуцыі Трэцяга мая ніякага паразумення на згубу Рэспублікі ці свабод баць-коўскіх мець не буду, прыступаючы да Вольнай канфедэрацыі пад актам ВКЛ[ітоўска]га ўтворанай і мар-шалкам генеральным, так мне Госпадзе Божа дапамажы." (НГАБ. Ф. 1900. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 580.)

29 жніўня 1792 г. канфедэрацыя ВКЛ заявіла аб падтрымцы з боку "40 тысяч народа літоўскага, брацця розных шляхты ва ўрадах у самім княстве"[21]. Прыведзеная лічба вызначалася колькасцю складзеных акцэсаў. Нельга, аднак, услед за таргавічанамі прымаць факт далучэння да канфедэрацыі за паказчык ухвалення і падтрымкі яе дзейнасці. Разнастайнасць формаў і тэрмінаў далучэння засведчыла захаванне шляхецкай супольнасцю ўласных палітычных прыярытэтаў, выяўленых у працэсе адаптацыі да дзейнасці новай улады ў краіне.

1 Korrespondent Warszawski. 1792. № 48. 21 жн.
2 Гл.: Ibid. № 48. Dodatek. 21 жн.
3 Ibid. № 40. Dodatek. 2 жн.
4 Ibid. № 39. 31 ліп.
5 Гл.: Szczygielski W. Referendum trzeciomajowy. Sejmiki lutowe 1792 roku. todz, 1994. S.359-361.
6 Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў. Ф. 41. Воп. 1/199. Адз. зах. 174. Арк. 141.
7 Костомаров Н.И. Старый спор. Последние годы Речи Посполитой. М., 1994. С. 450.
8 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1901. Воп. 1.Адз. зах. 1. Арк. 45а, 46.
9 Korrespondent Warszawski. 1792. № 49. 23 жн.
10 Гл.: Ibid. № 39. 31 ліп.; № 29. 7 ліп.
11 Korespondencja krajowa Stanislawa Augusta z lat 1784 do 1792 (oddruk z Rocznika Towarzystwa Historyczno-Leterackiego w Parizu na rok 1870). Poznari, 1872. S. 256.
12 Гл.: НГАБ. Ф. 1901. Воп. 1 Адз. зах. 1. Арк. 69, 119-120.
13 Гл.: Korrespondent Warszawski. 1792. № 55. Dodatek. 6 верас.
14 Гл.: НГАБ. Ф. 1901. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 19-31, 45а-61, 64, 69.
15 Гл.: Тамсама. Арк. 27-29.
16 Гл.: НГАБ. Ф. 1897. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 67 адв.
17 Гл.: НГАБ. Ф. 1900. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 579.
18 НГАБ. Ф. 1897. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 68.
19 НГАБ. Ф. 1900. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 594.
20 НГАБ. Ф. 1901. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 57; 31.
21 Анішчанка Я.К. Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. Мн., 2003. С. 279.

Паступіў у рэдакцыю 21.03.05.

***Вадзім Вадзімавіч Аніпяркоў*** - аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.

*І.У. КАБЯРЭЦ*

## ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСИ 60-90-х гг. XIX ст.: УМОВЫ СТВАРЭННЯ, ПРАВАВЫ СТАТУС, СТРУКТУРА І АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ

Анализируются условия создания общественных организаций Беларуси в 60-90-х гг. XIX в. Подчеркивается, что в этот период активизируется процесс самоорганизации общественных сил, начинается разработка законодательных основ деятельности добровольных организаций, происходит постепенное упрощение процедуры их создания. Дается характеристика уставов этих организаций, что позволяет определить их основные функции и структуру.

The article gives the analysis of conditions under which Belarusian public organizations were established in the 1860s - 1890s. It underlines that the period witnessed the self-establishment of public forces, the beginning of the legislation development oriented towards the principle activitiy of public organizations as well as the gradual simplification of the procedure of their establishment. It also presents the description of charters, which makes it possible to define the main functions and structure of these organizations.

Працэс самаарганізацыі грамадскіх сіл актывізуецца з канца 60-х гг. XIX ст., нягледзячы на шматлікія перашкоды. Гэты працэс выявіўся ў імкненні да стварэння грамадскіх арганізацый, добраахвотных таварыстваў'. Значна павялічылася колькасць аб'яднанняў, з'явілася шмат новых відаў арганізацый, узнялася іх актыўнасць, пашыраліся формы і метады работы. Так, у «Аглядзе Мінскай губерні за 1867 г.» адзначалася, што "вызваленне сялян, хуткае развіццё школ, чыгунка, якая прайшла праз губерню ў двух напрамках, і новыя ўстановы - сялянскія, судовыя, народнага аздараўлення і дабрачынныя - зварухнулі грамадства" (тут і далей пераклад аўтара. - *І. К.*). Ажыўленню грамадскага жыцця, безумоўна, спрыяў выхад у маі 1867 г. двух урадавых распараджэнняў: аб спыненні палітычных спраў, якія тычыліся ўдзельнікаў паўстання 1863 г., і палажэн-